педагогической речи», «средства выразительности педагогической речи»; знать определения средств выразительности, обладающих наибольшим мотивационным потенциалом в педагогическом дискурсе; представлять специфику проявления мотивационного потенциала выразительной педагогической речи в различных учебных жанрах образовательного дискурса; знать критерии отбора средств выразительности в педагогическом общении с учетом оценки их мотивационного потенциала; знать основные дидактические функции средств выразительности, обеспечивающие реализацию мотивационного потенциала в речи педагогов; знать особенности восприятия средств выразительности педагогической речи учащимися, обусловленные возрастными и индивидуально-психологическими особенностями; иметь представление о составляющих невербальной экспрессии в педагогическом общении. Это позволит будущим педагогам использовать средства выразительности в качестве эффективного средства влияния на мотивацию учения.

УДК: 821.161.3:82-1Марозаў

**А. У. Шлег**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## РОЛЯ ПРОСТЫХ ТРОПАЎ У ПАЭЗІІ ЗМІТРАКА МАРОЗАВА

**Уводзіны.** Для сучаснага разумення літаратурна-мастацкага стылю істотным з'яўляецца тое, «стыль з'яўляецца выражэннем глыбокай арыгінальнасці; валодае эстэтычнай дасканаласцю; уяўляе сабой змястоўную форму і, нарэшце, з'яўляецца ўласцівасцю ўсёй мастацкай формы твора, а не толькі яго моўнага боку, які, між іншым, мае для літаратурнага стылю важнейшае значэнне» [4, с. 238; 5].

Стыль выступае ў якасці аднаго з самых галоўных крытэрыяў мастацкасці твора. Толькі «стылёва завершаныя і стылёва дасканалыя творы валодаюць якасцю моцнага ўздзеяння на чытача, і толькі яны могуць прынесці яму сапраўдную эстэтычную асалоду» [7, с. 151].

Аналізуючы стыль, неабходна характарызаваць яго моўны бок, тропы, стылістычна-сінтаксічныя фігуры, фоніку твору.

**Асноўная частка.** Паколькі тропы з'яўляюцца важнейшым сродкам вобразнага адлюстравання і пазнання свету, асноўным шляхам узбагачэння літаратурнага тэксту новымі семантычнымі адценнямі, новымі сэнсавымі нюансамі, то ў літаратуразнаўстве ім належыць важнае месца.

Тропы — «слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні. Яны дапамагаюць лаканічна і вобразна выявіць сутнасць з'явы, індывідуалізаваць яе, даць ёй ацэнку. Адрозніваюць тропы простыя і складаныя. Простыя: эпітэт і параўнанне. Тропы могуць разглядацца як форма прысутнасці аўтара ў творы, відавочныя спосабы мадэлявання свету» [6, с. 72].

Эпітэт — «від простага тропа, мастацкае акрэсленне істотнай прыметы якога-небудзь прадмета ці з'явы. Вылучаюць эпітэты метафарычныя, гіпербалічныя, складаныя і іранічныя. Эпітэты дапамагаюць лаканічна і вобразна ахарактызаваць з'яву, даць ёй ацэнку, канкрэтызаваць, вылучыць патрэбную рысу ці адзнаку» [6, с. 128].

Змітрок Марозаў у сваіх вершах часта выкарыстоўвае сталыя эпітэты. Гэта найчасцей асэнсаванне навакольнай рэчаіснасці, адзнака традыцыйнасці, якія прыцягваюць увагу чытача. Сустракаюцца сталыя эпітэты ў вершы «Дэман»: *Хто я такі? **Бязмоўны дух** прыроды… // Я адчуваю чуйнаю **душой**… // Я дух! Нябачны **дух** дрымотнай **ночы**, // Трава **жывой** спатолена **крывёй**… // Я дух! Я **дэман** прывіднай **свабоды**, // Крыляю над бязмоўнаю **зямлёй*** [3, с. 196]. Менавіта дэман у міфалогіі ўвасабляецца як нячысцік альбо істота, якая шкодзіць людзям. Але Марозаў, выкарыстоўваючы эпітэты «***бязмоўны дух***» і «***дэман свабоды***», падразумявае прагу свабоды, а таксама страчаную чалавечнасць.

Эпітэт на працягу стагоддзяў разглядаўся як упрыгожванне мовы, якое надавала мастацкаму твору вытанчанасць і бездакорнасць стылю. У вершы «Начны коннік» вылучаюцца наступныя эпітэты: *Вечар. Золкае **вока поўні**, // Дальніх сёл светлякі агні, // Што шукае вандроўнік гэты? // Можа, **мары сваёй крыло**? // Ён сляпым **ясны зрок** вяртае, // А нямым — **сэнс** высокіх **слоў*** [3, с. 82]. У Бібліі слепата ў духоўным сэнсе ўласціва ўсім людзям, таму аўтар з дапамогай эпітэтаў характарызуе лірычнага героя, які дапамагае людзям вылечыць няздольнасць бачыць ісціну.

А. М. Весялоўскі даваў такое вызначэнне разбіраемага намі спосабу стварэння вобразнасці: «Эпітэт — аднабаковае вызначэнне слова, альбо абноўленае яго намінальнае значэнне, альбо ўзмацняльная якасць якога-небудзь характэрнага прадмета» [4, с. 442]. Так, у наступных вершах узмацняецца якасць лірычнага героя, напрыклад у вершы «Сустрэча»: *Куды брыдзеш ты змрочным **ценем**?... // Здаецца, нейкі злосны **геній**... // І абыякавай **рукою**… // Твой **крыж** нялёгкі**,** служка **божы*** [1, с. 66]. Таксама гэта яскрава бачна ў вершы «Матчына сляза»: *Успомніла, як бяссонымі **зімовымі начамі** // Завіхалася каля свайго харавітага*

© Шлег А. У., 2019



Репозиторий БарГУ

***хлопчыка**, // Горкія **сумненні** ўдзень і ўночы точаць сэрца маці, // Забіраюць у яе апошняе **здароўе**… // Налітая цяжкім, невыказаным **горам** сляза // Упала на шэрую магільную пліту* [2, с. 70].

Параўнанне — «такое супастаўленне двух прадметаў, з'яў або паняццяў, у выніку якога сутнасць аднаго з іх вытлумачваецца праз сутнасць другога» [6, с. 112]. Параўнанне робіць паэтычны малюнак жывапісным, дакладным і наглядным, гэта добра бачна ў вершы «Млечны шлях»: ***Бялее** ў цемрадзі **дарога,** // **Нібы разліў хтось малако*** [1, с. 20]. Змітрок Марозаў праз гэты троп паказвае прыгажосць нашай Радзімы, якую мы часта не заўважаем у паўсядзённай мітусні. Аўтар нібыта спыняе цябе і заклікае паглядзець у неба, успомніць пра свой родны парог.

У кароткай літаратурнай энцыклапедыі падаецца наступнае вызначэнне параўнання: «у стылістыцы і паэтыцы адзін са спосабаў ускоснай характарыстыкі з'явы; параўнанне мяркуе прыпадабненне аднаго прадмета іншаму, у выніку чаго выяўляецца і ўзмацняецца некаторая агульная прыкмета, якая можа заставацца і не названай» [7, с. 708].

У параўнанні выяўляецца своеасаблівасць пісьменніка як мастака, яго стаўленне да таго, што адлюстроўваецца ў творы, напрыклад у вершы З. Марозава «Нібы на астылым вулкане»: ***Нібы на астылым вулкане,** // На котлішчы родным стаю. // **Нібы не было развітання** // І я не кружляў, **як лісток*** [1, с. 73].

Параўнанне не толькі робіць аўтарскае апісанне наглядным, псіхалагічна дакладным, але таксама гаворыць пра аўтарскую пазіцыю. Верш «Снежны чалавек»: *Здаецца ўсё часцей, // Што я, **як снежны чалавек**, // Жыву сярод людзей* [1, с. 105]. Выкарыстанае параўнанне нібыта заклікае вярнуцца да вытокаў, любіць адзін аднаго і падтрымліваць.

У вершы «Чаму няма былому веры» выкарыстоўваецца наступнае параўнанне: *Баюся за цябе, краіна, // Суцішся, ад страсцей астынь… // Ты, **як вясновая ільдзіна,** // Якую крышыць часу плынь* [1, с. 167]. На прыкладзе гэтага тропа можна прасачыць і другую функцыю іншасказальнай вобразнасці: выяўляць сутнасць той або іншай з'явы, звычайна прыхаваную, заключаны ў ім паэтычны сэнс. Паэт пры дапамозе параўнання запрашае чытача ўглядзецца ў сутнасць нашай Радзімы, убачыць яе з незвычайнага боку, адчуць веліч яе ролі ў жыцці народа.

**Заключэнне.** Вобразнасць паэтычнай мовы залежыць найперш ад выкарыстання выяўленчых сродкаў, сярод якіх важную ролю адыгрываюць эпітэты і параўнанні. Менавіта яны ў паэзіі Змітрака Марозава дапамагаюць ахарактарызаваць прадметы, жыццёвыя з'явы дакладна і featured рознабакова, падаюць вобраз яркім і запамінальным, а мову больш выразнай.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Марозаў, З. Д.* Ачышчэнне сяўбой : [паэзія] / З. Д. Марозаў. — Мінск : Маст. літ., 1992. — 334 с.
2. *Марозаў, З. Д.* Гронкі зорных суквеццяў : вершы, паэма, вянкі санетаў / З. Д. Марозаў. — Мінск : Маст. літ., 1998. — 365 с.
3. *Марозаў, З. Д.* Хлебны верасень : вершы, паэмы : для ст. шк. узросту / З. Д. Марозаў ; маст. Г. С. Хінко-Янушкевіч. — Мінск : Юнацтва, 1988. — 143 с.
4. *Чернец, Л. В.* Введение в литературоведение. Литературное произведение. Основные понятия и термины : учеб. пособие / Л. В. Чернец. — М. : Высш. шк. : Академия, 1999. — 556 с.
5. Краткая литературная энциклопедия : в 9 т. / под общ. ред. А. Суркова. — М. : Совет. энцикл., 1972. — Т. 7. — 1008 с.
6. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 3-е выд., дапр. і дап. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
7. *Яцухна, В. І.* Тэорыя літаратуры : дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 279 с.


Репозиторий БарГУ